**Юрмальнік А.П.,**
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай
мастацкай культуры

# ДА ПЫТАННЯ АБ ВЫЗНАЧЭННІ ЭСТРАДЫ ЯК ВІДУ МАСТАЦТВА

Эстрада — адна з самых распаўсюджаных з' яў у сучаснай мастацкай культуры. Выступленні ансамбляў лёгкай музыкі, спевакоў, фельетаністаў, спектаклі тэатраў мініяцюр прыцягваюць да сябе ўвагу шматмільённай аўдыторыі. Радыё і тэлебачанне таксама шырока выкарыстоўваюць у сваіх перадачах эстрадныя жанры.

Вызначэнне такой з'явы, як эстрада, мае некалькі тлумачэнняў. З аднаго боку, слова "эстрада" абазначае пляцоўку, на якой адбываецца відовішча — спектакль; з другога — гэтая назва характарызуе цэлы накірунак мастацкай дзейнасці чалавека, звязаны з правядзеннем вольнага часу, стварэннем забаўляльных праграм.

Калі разглядаць першае азначэнне эстрады (пляцоўка), дык можна нагадаць пераклад гэтага слова з лацінскай мовы: "насціл, памост, узвышаная пляцоўка". Эстрадай называюць адкрытую канцэртную пляцоўку, прыўзнятую над зямлёй ці над радам крэслаў у зале, што стварае ўмовы для адкрытага, свабоднага выканання, калі акцёра не аддзяляюць ад публікі ні занавес, ні рампа і ён цесна звязаны з гледачом.

Эстэтыка эстраднага выканання прадугледжвае максімальныя давер і шчырасць артыста ў адносінах да публікі. Нездарма якраз на эстраднай сцэне ўсталёўваецца жанр лірычнай песні, песні-споведзі: вялікая частка рускіх гарадскіх рамансаў, творы французскіх шансанье, неапалітанскія песні, аўтарская песня і інш. Любоўная лірыка, якая ўвасабляецца на эстрадзе, прадугледжвае вялікую ступень даверу аўтара-артыста да публікі, што і дазваляе з'явіцца своеасаблівай споведзі. Цеснае збліжэнне выканаўцы і гледачоў стварае атмасферу ўзаематворчасці.

Репозиторий БГУКИ

Эстраднае выкананне ва ўсіх жанрах прадугледжвае значную долю імправізацыйнасці, што ўключае асабістую аўтарскую трактоўку, высокі артыстызм, а таксама здольнасць адгукацца на запатрабаванні публікі, рэагаваць на яе эмацыянальны стан.

Важнымі ўласцівасцямі эстраднага мастацтва з'яўляюцца святочнасць і разнастайнасць, што вызначаецца першапачатковай і асноўнай функцыяй эстрады — пацяшальнай. Імкненне да неаслабнага захопу ўвагі гледача з боку эстрадных артыстаў вызначала яскравасць, незвычайнасць, жанравую разнастайнасць эстраднага канцэрта, а таксама садзейнічала развіццю новых эстрадных формаў (тэатр-кабарэ, мюзік-хол, рэвю-тэатр і інш.).

Імкненне эстрадных артыстаў да арыгінальнасці, святочнасці ў сваю чаргу адпавядае жаданню чалавека насыціць свой вольны час, адпачынак новымі ўражаннямі, мастацкімі адкрыццямі, станоўчымі эмоцыямі. Гэта дазволіць часова адмовіцца ад нейкіх абавязацельстваў, празмернай рэгламентацыі паводзін, сваёй асноўнай сацыяльнай ролі. А гэта вельмі важны псіхалагічны фактар, які ў многім вызначае актыўнае развіццё і вялікую папулярнасць эстраднага мастацтва ў XX ст. Арыгінальнасць, яскравасць, святочнасць эстраднага мастацтва выяўляюцца ў высокім майстэрстве артыста, якое ўжо само па сабе становіцца прадметам захопленых адносін гледачоў.

Эстраднай святочнасці і разнастайнасці адпавядае жанравая свабода: новыя сінтэтычныя спалучэнні на эстрадзе ўтвараюцца і распадаюцца даволі лёгка. Напрыклад, спевы і драматычнае мастацтва, зліваючыся, даюць жыццё тэатралізаваным спевам; тэатралізаваныя спевы, у сваю чаргу, далучаюць да сябе танец і, такім чынам, сучасныя эстрадныя спевы становяцца досыць складаным паводле структуры мастацтвам. Гэта патрабуе ад эстраднага артыста дасканалага валодання многімі прафесійнымі навыкамі, якія знаходзяцца "на стыку" некалькіх відаў мастацтва.

Репозиторий БГУКИ

Яшчэ адной неад'емнай уласцівасцю эстраднага мастацтва з'яўляецца лаканічнасць. Лаканічнасць і канцэнтрацыя выразных сродкаў на эстрадзе цяпер цалкам адпавядаюць духу, тэмпу і рытму часу. Гэта выяўляецца ва ўсіх баках эстрады: у аўтарскім сачыненні, акцёрскіх сродках яго ўвасаблення, кампанентах знешняга афармлення эстраднага нумара, ва ўмовах дэманстрацыі.

Трэба адзначыць, што названыя асноўныя ўласцівасці сучаснага эстраднага мастацтва прысутнічаюць на ўсіх этапах развіцця эстрады ад старадаўніх свят, хадоў і карнавалаў, скамароства кірмашовых паказаў да сучасных эстрадных канцэртаў і спектакляў. Само ж мастацтва эстрады ідзе сваімі каранямі ў далёкае мінулае: яго элементы сустракаліся яшчэ ў старажытных Грэцыі і Рыме. Продкамі сучасных эстрадных артыстаў можна лічыць французскіх жанглёраў, нямецкіх шпільманаў, польскіх франтаў, расійскіх скамарохаў.

Народнымі вытокамі тлумачацца такія асаблівасці эстраднага мастацтва, як дэмакратычнасць, агульнадаступнасць, папулярнасць. Эстрада ўзнікла і сфарміравалася як мастацтва, блізкае і зразумелае народу. Яно захавала гэтую ўласцівасць і ў нашы дні. На працягу шматвяковай гісторыі эстраднаму мастацтву была ўласцівая перавага выканальніцкай імправізацыйнасці. Блазны, скамарохі, клоуны стваралі выступленні з улікам паводзін і настрою публікі. Камедыя дэль артэ, якую звычайна лічаць адным з тэатральных жанраў, таксама змяшчала значную долю эстраднасці менавіта дзякуючы ўласцівай ёй імправізацыйнасці.

Такім чынам, эстрада — гэта від мастацтва, што канчаткова сфарміраваўся ў XX ст. Ён вызначаецца такімі рысамі, як адкрытасць, дэмакратычнасць, даступнасць, святочнасць, лаканічнасць. На эстрадзе канцэнтруюцца розныя жанры музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага мастацтваў, што ў цэлым стварае непаўторную і вельмі папулярную з'яву культуры — эстраднае мастацтва.

Рэпазіторый БГУКІ